# «ЛЬЕЦЦА ЦЫМБАЛАЎ СПЕЎ»

**Прысвячаецца Міжнароднаму фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік», які праходзіць у Паставах.**

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** **3.** Напеў. **9.** Частка свету. **10.** Дадатковы тэкст. **11.** «Біце, біце ў ... — // Не зважайце, што я малы, // Дуйце, дуйце ў жалейкі — // Не жалейце, што маленькі». Прыпеўка. **14.** У стральца і музыкі ... невялікі (прык.). **15.** «Піла яна, піла — // Захацела гуляці: // Мусіў ... для дзяўчыны // Цымбалы наняці». З беларускай народнай песні «А пад гаем, гаем». **16.** «Ой, гармонь, ой, гармонь, // Не спаліў цябе агонь,//Не ўзяла цябе ..., // Як я была малада». Прыпеўка. **19.** Прыўзнятая раўніна. **20.** У грэчаскай міфалогіі боства, якое ўвасабляе сілы прыроды. **21.** Тое, што і скочка. **22.** «А чырвоны ... // Жарыў у гармонік». З вершаванай казкі Я. Коласа «Ракувусач». **24.** Смех — найлепшыя ... (прык.). **25.** «Ігрaйце, музыкі, // У мяне ... вялікі. // А мне бацька паплеў, // Каб было да Пакроў». Прыпеўка. **28.** І ... мае адносіны да музыкі — яго скуру нацягваюць на барабан (жарт). **32.** «Пад дуду і пад цымбалы // Топне, праспявае. // Сцеражыцеся, усе людзі: // ... гуляе!». З верша Я. Купалы «Ігнату Буйніцкаму». **34.** Японскае нацыянальнае адзенне. **35.** Гэта табе ...: калыхала мяне — калышы і ўнука (з беларускай народнай песні «Каваль»). **36.** «Пакуль што народ мой спявае — // ... — матуля жывая». З верша С. Валодзькі «Спяваюць жанчыны».

**ПА ВЕРТЫКАЛІ:** **1.** Патрэба ў кім-, чым-небудзь. **2.** «Ай, гармонь мая тальянка, // За ракой жыве Мар'янка. // Калі б меў я чаўначок, // Пераплыў бы на той ...». Прыпеўка. **3.** «Ах, як за акном гармонік грае! // Пусці, ..., выйду, пагуляю». З верша П. Броўкі «Пусці, маці». **4.** Прыбор для штучнага асвятлення. **5.** Плывучая землечарпальная машына. 6. Металічны стрыжань у звоне. **7.** З песняю і конь лягчэй ... цягне (прык.). **8.** Буйны музычны твор. **12.** «Даюць дыхту, даюць жару, // «Сербіянку», «Польку» шпараць, // А гармонік грае, грае». З верша Я. Купалы «...». **13.** «..., ..., // Малінавы шчочкі, // З-за цябе я, гарманіст, // Не даспала ночкі». Прыпеўка. **17.** «... памаладзеў, // Льецца цымбалаў спеў». З верша-песні А. Нафрановіча, прысвечанага Міжнароднаму фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік». **18.** «Пад цымбалы, пад цымбалы // Там Лявоніха скакала! // А цяпер пад тыя гукі // Скачуць праўнукі і ...». З верша А. Пісьмянкова «Без цымбалаў немагчыма». **21.** «Пайду барыню скакаць, // Надзену ..., // Буду ножкі падымаць // Вышэй табурэткі». Прыпеўка. **23.** «»Хапіўшы ... гарэлкі, // Амур яшчэ павесялеў — // Іграць пачаў ён на жалейцы // І дзеўкам стройна песні пеў». З паэмы «Тарас на Парнасе». **26.** Металічнае пакрыццё паверхні абразоў. **27.** Цяжкасці (перан.). **29.** Убранне. **30.** Пра добрую бясхмарную пагоду. **31.** Клавішы гармоніка, духавых інструментаў. **33.** Скрыпучая вярба ... вякі жыве (прык.).

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.**
*г. Дзяржынск.*



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** **3.** Мелодыя. **9.** Еўропа. **10.** Зноска. **11.** Цымбалы. **14.** Хлеб. **15.** Казак. **16.** Вада. **19.** Плато. **20.** Німфа. **21.** Блыха. **22.** Конік. **24.** Лекі. **25.** Лапці. **28.** Асёл. **32.** Беларус. **34.** Кімано. **35.** Навука. **36.** Радзіма.

**Па вертыкалі:** **1.** Недахоп. **2.** Бок. **3.** Маці. **4.** Лямпа. **5**. Драга. **6.** Язык. **7.** Воз. **8.** Кантата. **12.** Вечарынка. **13.** Гарманіст. **17.** Горад. **18.** Унукі. **21.** Балеткі. **23.** Кілішак. **26.** Аклад. **27.** Церні. **29.** Убор. **30.** Ясна. **31.** Лад. **33.** Два.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.39 | 21.39 | 17.00 |
| Віцебск — | 4.20 | 21.37 | 17.17 |
| Магілёў — | 4.29 | 21.30 | 17.01 |
| Гомель — | 4.35 | 21.17 | 16.42 |
| Гродна — | 4.56 | 21.53 | 16.57 |
| Брэст — | 5.06 | 21.44 | 16.38 |

### Месяц

*Поўня ў 16.09*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

***Пр.** Фядоры, Івана, Купрыяна, Ніла, Фёдара.*
***К.** Ганны-Марыі, Пелагеі, Рычарда, Станіслава, Феліцыяна.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 9 ЧЭРВЕНЯ



**1267** год — у адпаведнасці з летапіснымі хронікамі, быў заснаваны Магілёў. У 1661 годзе быў зацверджаны герб горада — на блакітным полі 3 вежы, у адчыненай браме сярэдняй — фігура рыцара ў кальчузе з мячом у руцэ. На вежы — круглая шыльда з выявай «Пагоні». У 1616 годзе ў горадзе была заснавана брацкая друкарня, якая праіснавала да 1773 года: яна паспрыяла распаўсюджванню пісьменнасці сярод насельніцтва. У 1812 годзе горад быў акупіраваны французскімі войскамі пад камандаваннем маршала Даву. Чатырохмесячнае знаходжанне французаў у Магілёўскай губерні абумовіла страты ў 33,5 мільёна рублёў асігнацыямі. У гады Першай сусветнай вайны з 21 жніўня 1915-га па 26 лютага 1918 года ў Магілёве знаходзілася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага рускай арміі.

**1672** год — нарадзіўся Пётр I (1672—1725), рускі цар з 1682 года, першы расійскі імператар (з 1721-га), заснавальнік Санкт-Пецярбурга.

**1868** год — нарадзіўся (г. Пскоў) Уладзіслаў Вярыга, польскі філосаф і этнограф, доктар філасофіі. Збіраў беларускі фальклор. У часопісе «Собрание сведений по отечественной антропологии» апублікаваў працу «Беларускія песні з вёскі Глыбокае Лідскага павета Віленскай губерні, запісаныя ў 1885 годзе», у якой змясціў 45 беларускіх народных песень. Аўтар кнігі «Беларускія паданні», у якую ўвайшлі 32 беларускія народныя казкі, запісаныя ў Лідскім павеце.

**1942** год — адбыўся бой паміж беларускімі партызанамі і нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў вёсцы Налібакі (тады — Івянецкага раёна), які ўвайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пад назвай Налібоцкі бой. 125-ы партызанскі атрад імя Сталіна (камандзір С. А. Рыжак) разграміў у Налібаках паліцэйскі ўчастак і затым уступіў у бой з нямецкімі карнікамі, якія прыбылі з Рубяжэвічаў. У выніку 2-гадзіннага бою партызаны знішчылі і ўзялі ў палон 25 гітлераўцаў, спалілі валасную ўправу, паліцэйскую сталовую, тры грузавыя аўтамашыны, захапілі зброю, боепрыпасы і іншыя трафеі.

**1945** год — Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР заснаваны медалі «За ўзяцце Берліна», «За ўзяцце Будапешта», «За ўзяцце Вены», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За вызваленне Бялграда», «За вызваленне Варшавы», «За вызваленне Прагі».

### Было сказана

**Рэй БРЭДБЕРЫ, амерыканскі пісьменнік:**
*«Каб выжыць, трэба перастаць дапытвацца, у чым сэнс жыцця. Жыццё само па сабе і ёсць адказ».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Рэгламент дарожных рамонтных работ:**
**1. Нанесці свежую разметку.**
**2. Замяніць асфальтавае палатно.**
**3. Пракласці новую каналізацыю.**

— Сёма, а праўда, што Вова падпільнаваў цябе ў лесе і набіў морду за тое, што ты спаў з яго жонкай?
— Ды што там за лес? Так, дзясятак дрэў!

**Рыбацкая мудрасць:**
**Калі рыбу з вечара добра прыкарміць гарэлкай, то з раніцы яна выдатна бярэцца на піва.**

У рэстаране афіцыянт звяртаецца да наведвальніка:
— Падніміце, калі ласка, галаву — я вам салату памяняю...

**Люблю боўлінг.**
**Гэта адно з нешматлікіх месцаў, дзе можна піць піва і пры гэтым думаць, што займаешся спортам.**




Малюнак Пятра КОЗІЧА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2183.
Нумар падпісаны ў 19.30 8 чэрвеня 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12